МИНИСТЕРСТВО ОБРАЗОВАНИЯ РЕСПУБЛИКИ БЕЛАРУСЬ

БАРАНОВИЧСКИЙ ГОСУДАРСТВЕННЫЙ ВЫСШИЙ
ПЕДАГОГИЧЕСКИЙ КОЛЛЕДЖ

# СБОРНИК

# СТУДЕНЧЕСКИХ НАУЧНЫХ РАБОТ

Барановичи
2001

# ФИЛОЛОГИЧЕСКАЯ СЕКЦИЯ

Т. Вакульчык, І. Смаршчок,
Л. Шэйка, студэнткі VI курса
факультэта тэорыі і методыкі
пачатковага навучання

## ДА ЛІНГВІСТЫЧНАГА АНАЛІЗУ ВЕРША К. КАЛІНОЎСКАГА "МАРЫСЬКА ЧАРНАБРОВА, ГАЛУБКА МАЯ..."

прад'яўлена старэйшым выкладчыкам кафедры тэорыі і практыкі
інтэркультурнага навучання, магістрам педагагічных навук
В.М. Шавель

Кастусь Каліноўскі – аўтар аднаго толькі верша «Марыська чарнаброва, галубка мая...» Дык паэт ён ці не? Паэт, калі гэты верш – паэзія, а верш К. Каліноўскага напісаны на глыбокім паэтычным дыханні, хваляванні, драматызме.

Верш «Марыська чарнаброва, галубка мая...» – мужная споведзь чалавека вялікага духоўнага гарэння. Тое, што К. Каліноўскі ў перадсмяротныя хвіліны ўзяўся за пяро як паэт, гаворыць не толькі аб разуменні ім эмацыянальнай сілы ўздзеяння вершаванага слова, але і аб нязломнасці духу самога аўтара. Лірычную форму верша К. Каліноўскі, па сутнасці, упершыню ў новай беларускай літаратуры напаўняў высокім рэвалюцыйна-дэмакратычным зместам. Доказам гэтаму з'яўляюцца даследаванні літаратуразнаўцаў. У сваёй большасці яны сыходзяцца на тым, што двухадрасаванасць верша раздзяляе яго на два: «Марыська чарнаброва, галубка мая...», прысвечаны каханай Каліноўскага, і «Калі за нашу праўду бог нас стаў караці...» – развітанне з беларускім народам. Думаецца, што рэальных падстаў для гэтага няма. Верш раскрывае здзіўляючую цэласнасць асобы рэвалюцыянера: трапяткія, пяшчотныя радкі, звернутыя да любай, досыць арганічна спалучаюцца ў ім з набатнымі зваротамі да роднага народа; горыч паражэння, развітання з каханай змяняецца упэўненасцю ў лепшай будучыні.

Узнікае і другое пытанне: калі гэта непасрэдна інтымны зварот аўтара да каханай, то хто з'яўляецца прататыпам галоўнай гераіні – Марыські? Вядома, што дадзены лірычны твор мае біяграфічную аснову. Пасля паражэння паўстання ў Вільні Каліноўскі нелегальна жыў на кватэры ў гаспадыні Грэгатовіч, у якой была дачка Марыля. Магчыма, паміж Кастусём і Марыляй былі і больш блізкія

ўзаемаадносіны. Па іншых звестках, гэты верш прысвечаны Марыі Ямант, нявесце Каліноўскага, якая ўваходзіла ў Віленскую рэвалюцыйную арганізацыю.

У невялікім вершаваным творы ўсяго пяць чатырохрадкоўяў, знітаваных парнымі рыфмамі. Верш пачынаецца мінорна, засмучана. Аб самым галоўным пытаецца паэт у Марыські: «Дзе ж падзелася шчасце і ясна доля твая?» Прайшло шчасце, прайшло якраз тады, «калі за нашу праўду бог нас стаў караці», калі рэвалюцыянера арыштавалі, калі ішла вочная стаўка – апошняя сустрэча Каліноўскага з Марыськай. Свой сум і боль лірычны герой пераадольвае. Рэвалюцыянер поўны ўсведамлення таго, што хоць «мы прападзем марна, но праўды не пакінем». У фінале голас яго гучыць завяшчальна-ўрачыста, па-чалавечы цёпла і разам з тым горда, непакорна, з думкай, што змаганне не скончылася, яно – наперадзе.

Вобразнасць верша, у цэлым, – народна-песеннага каларыту: дзяўчына прыпадабняецца да галубкі, развіваюцца традыцыйныя фальклорныя матывы пошукаў «шчасця, яснай долі», першыя два радкі надаюць вершу журботна-шчымлівае, як у народных песнях аб нядолі, гучанне. Для верша К. Каліноўскі бярэ і рэлігійна-хрысціянскую сімволіку, якая на той час мела вялікі ўплыў на ўяўленні чытача. Адсюль – бог, матывы «прадвечнага суда», неба як прыстанішча вечнага шчасця людскога, кары, якая звязваецца з карай божай.

Апошнія восем радкоў верша – запаветныя. Прычым не толькі лірычна-развітальныя – з агульнымі пажаданнямі народу шчасця, са сціплай просьбай: «часам спамяні пра Яську свайго.» Бо ўжо ў пажаданні «жыві ў свабодзе» чуецца голас прамоўцы, а ціхая просьба «спамяні пра Яську свайго» – гэта толькі ўдакладненне, якога ўспомніць Яську, – таго, «што загінуў за праўду для дабра твайго», прычым гэтыя словы пераводзяць радок з мройліва-журботнага гучання ў суровае, цвёрдае.

Найбольш цікавы верш «Марыська чарнаброва, галубка мая…» ў марфалагічных адносінах. Гэта выражаецца і ў тым, што ў тэксце няма ярка выражанай дамінуючай часціны мовы. Паводле частотнасці ўжывання ў тэксце на першым месцы знаходзяцца назоўнікі. Яны надаюць твору своеасаблівую статычнасць, падкрэсліваючы, што дзеянні з лірычным героем адбываюцца ў дадзены момант. Акрамя таго, назоўнікі паводле свайго сэнсу падабраны аўтарам такім чынам, што падкрэсліваюць ідэйную накіраванасць твора. Так, назоўнікі «бяздоля», «воля», «кара», «свабода», «праўда», «грамада», «горыч» нясуць у сабе асноўную сэнсавую нагрузку. Усе яны асацыіруюцца ў

нашай свядомасці з рухам, барацьбой, змаганнем. Таму, так часта ўжываючы іх, аўтар падкрэслівае ваяўнічы, змагарскі настрой лірычнага героя, яго духоўнае гарэнне, якое праяўляецца ў імкненні да дзеяння.

Пабуджэнне да барацьбы падкрэсліваецца частым ужываннем дзеясловаў і дзеяслоўных форм, якія ствараюць не проста дынаміку верша, а перадаюць дынаміку душы героя, дзейснасць яго натуры. Як бы падкрэсліваючы неабходнасць ад слова перайсці да «дзела», аўтар выкарыстоўвае спачатку дзеясловы «памаліся», «прападзём», а затым, як бы пабуджаючы да дзеяння, дзеясловы «станавіся», «караці» і інш. Лірычны герой не толькі сам прагне дзеяння. Ён пабуджае да дзеяння свой «народзе». Выкарыстаная форма клічнага склону назоўніка «народ» сведчыць пра выражэнне пяшчоты, любасці паэта да народа, мае адценне ўзвышанасці.

Пабуджэнне да дзеяння выражаецца і даволі частым ужываннем займеннікаў. Па ступені частотнасці ўжывання яны займаюць у вершы трэцяе месца пасля дзеясловаў. Большасць з іх паводле разраду па значэнню з'яўляюцца прыналежнымі («сваю», «свайго», «твайго», «нашу»).

Заступнік народных нізоў, лірычны герой не аддзяляе сябе ад свайго народа і падкрэслівае гэта менавіта выкарыстанымі займеннікамі: «Калі за нашу праўду бог нас стаў караці…», «І часам спамяні Яську свайго…» Гэтае адзінства ён, Яська, выяўляе не толькі на словах, але і на справе, ахвяруючы сваім жыццём дзеля народа, яго шчасця і дабрабыту.

«Марыська чарнаброва, галубка мая…» – верш-развітанне, шкадаванне, зварот. Верш напісаны «з-пад шыбеніцы», таму зразумелым становіцца і выкарыстанне дзеясловаў з суфіксам –ці (караці, прападаці): для надання вершу асаблівай мілагучнасці, стылізацыі пад народную песню, песню-плач.

К. Каліноўскі, які ўсведамляе трагічнасць свайго становішча,- жывы чалавек, і гэтым можна тлумачыць мінорны пачатак верша, змену мінорнага і мажорнага настрояў у другой, трэцяй, чацвёртай строфах. Аднак Кастусь Каліноўскі быў і чалавекам, які ўзяў на сябе цяжкую ношу адказнасці за лёс сваёй краіны, таму не выпадковы мажорны настрой у апошняй страфе верша, што дае магчымасць успрымаць увесь верш як своеасаблівы запавет нашчадкам.